Источник: "Беларусь" - 2013-05-21, №7



# Вяртанне Брэсцкай Біблії




**У свеце захавалася каля чатырох дзясяткаў экзэмпляраў Брэсцкай, або Радзівілаўскай, Біблії. Восем — у Маскве, пяць — у Санкт-Пецярбургу, два — на тэрыторыі Беларусі… Акрамя прыватных калекцый, фаліянт знаходзіцца ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы імя М. Салтыкова-Шчадрына (Санкт-Пецярбург), бібліятэцы Акадэміі навук Літвы, польскай бібліятэцы Ягелонскага ўніверсітэта горада Кракава, у Беларусі — у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы НАН імя Я. Купалы і ў Нацыянальнай бібліятэцы.**




А ў Брэсце ёсць толькі кніга, узноўленая ў 2003 годзе сумеснымі намаганнямі прафесара вышэйназванага Ягелонскага ўніверсітэта, дырэктара выдавецтва Collegium Columbinum Вацлава Валецкага і мецэната Пятра Кралікоўскага.

Як выправіць такую прыкрую незаслужанасць і якім павінен быць… дыяметр святочнага торта да 450-годдзя Брэсцкай Біблії? Адказы на гэтыя пытанні шукалі навукоўцы з Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы, Латвіі і Польшчы. У Брэсце, падчас правядзення міжнароднага круглага стала "Брэсцкая Біблія — унікальны помнік культуры XVI стагоддзя". Так часта словы "ўнікальны" і "сенсацыя", упэўнена, ніколі не гучалі ў канферэнц-зале мемарыяльнага комплексу "Брэсцкая крэпасць-герой".

Кніга-юбіляр сапраўды вартая, каб пра яе ўспамінаць праз 450 гадоў. Хоць бы таму, што выхад у свет яе першага экзэмпляра — 4 верасня 1563 года — адбыўся раней, чым заснавальнік друкарскай справы ў Расіі Іван Фёдараў выдаў сваю першую кнігу "Апостал" на царкоўнаславянскай мове.

Брэсцкая Біблія ўяўляла сабою пераклад, зроблены з арыгінальных моў — грэчаскай і яўрэйскай. На польскую. Тады гэта была мова ўсходнееўрапейскіх кальвіністаў. 738 старонак і 14 гравюр. Па-майстэрску выкананыя застаўкі, віньеткі, вялікія літары. Ёсць каментарыі да тэксту на палях. Гравюры "Патоп", "Калены Ізраілевы", "Фантан" лічацца шэдэўрамі графікі XVI стагоддзя.

Самае вялікае па аб'ёме друкаванае выданне XVI–XVIII стагоддзяў Вялікага княства Літоўскага ўпершыню ў гісторыі беларускага кнігадрукавання мела прадметны паказальнік і скураны пераплёт з металічнымі ражкамі.

Валянціна Казловіч. Вяртанне Брэсцкай Біблії

Калі сёння мы захапляемся, значыць, нездарма стараста Берасцейскі князь Мікалай Радзівіл Чорны плаціў лепшым у Еўропе мастакам і перакладчыкам.

Біблія — сімвал Брэста. Нараўне з Брэсцкай уніяй, Брэсцкім мірам, Брэсцкай крэпасцю. На яе цяперашняй тэрыторыі некалі стаяла друкарня, дзе надрукавалі Стары і Новы Запаветы.

Але чаму кніга з'явілася тут? Ёсць меркаванне: яна проста не магла быць выдадзеная ў каталіцкай Польшчы. Толькі ў ВКЛ, дзе неканфліктна суіснавалі розныя канфесіі.

Міжнародны "круглы стол" да юбілею выдання арганізавала Брэсцкая абласная бібліятэка. Каманда пад кіраўніцтвам дырэктара Тамары Данілюк па-майстэрску вяртае страчаную спадчыну. Ужо некалькі гадоў праводзіць канферэнцыю "Берасцейскія кнігазборы" з удзелам навукоўцаў з розных краін. Так, кнігі вяртаюцца ў віртуальным выглядзе. Фаліянты ніхто не аддае (пакуль). І ў планах — выкупіць экземпляр Брэсцкай Бібліі, які ацэньваецца прыблізна ў 30 тысяч долараў.

Ці папоўніцца бібліятэчны фонд арыгінальным выданнем XVI стагоддзя і калі гэта адбудзецца, можна будзе гаварыць пасля яго з'яўлення на букіністычных аўкцыёнах. Важна адсочваць сітуацыю, не прапусціць момант. А неабходныя сродкі напэўна дапамогуць сабраць спонсары і брастаўчане. Брэсцкая Біблія павінна вярнуцца дадому.

Не раз мне давялося чуць, што ніколі з моманту выдання Брэсцкай Бібліі яе так дэталёва не даследавалі. Як кнігу. Як помнік гісторыі. Як сакральнае выданне. Яе ілюстрацыі,



*Князь Мікалай Радзівіл Чорны — стараста Берасцейскі — з'яўляецца спонсарам выдання Брэсцкай Бібліі. Вучоныя лічаць: князь — не толькі спонсар, ён — ідэйны натхніцель выдання. Ён хацеў зрабіць горад цэнтрам пратэстантызму*

шрыфты. Уплыў на іншыя выданні Бібліі. З дыскусіямі на такім высокім інтэлектуальным узроўні.

Намеснік дырэктара Брэсцкай абласной бібліятэкі Ала Мяснянкіна абяцае: будзе выдадзены зборнік дакладаў. Ён павінен стаць — ні многа ні мала — навуковай сенсацыяй. Меркаванню бібліятэкараў я ахвотна веру.

На канферэнцыі навукова адкрывалі не толькі Біблію. Залу "ўзарваў" даклад загадчыка кафедры Брэсцкага тэхнічнага ўніверсітэта Анатоля Гладышчука. Фізік даўно захапляецца лірыкай: гістарычнымі даследаваннямі. Ён прынёс галіны береста (па легендзе Бярэсце — ад слова "бераст") і аргументавана заявіў: першае дакументальнае ўпамінанне аб горадзе — 1017-ы, а не 1019-ы...

Брэст — горад богам сцеражоны. Так прынята называць паселішчы, дзе калі-небудзь выдавалася Біблія. Я ўпершыню чула падобнае азначэнне — з вуснаў доктара гістарычных навук з Украіны Леаніда Цімашэнкі.

Што ж, так і ёсць. Можа, у выратаванне гістарычнай праўды юбілей горада кампрамісна адзначаць два гады? Зрэшты, адзін брэсцкі рамеснік апярэдзіў афіцыйнае меркаванне і ў дні навуковага форуму ў крэпасці прапаноўваў усім жадаючым уласнаручна адчаканіць памятныя солiды і медалі да 1000-годдзя. Паспрабавала. Спадабалася.

Гэтыя манеты-магніцікі можна павесіць на халадзільнік. А вось бронзавыя медалі ў гонар юбілею кніжнага фаліянта належыць захоўваць як нумізматычную рэдкасць. Іх усяго паўсотні. Выраблены мастаком-эмальерам Мікалаем Кузьмічом, які ўзнавіў Крыж Еўфрасінні Полацкай. Удзельнікам "круглага стала" аўтар уручыў медалі асабіста. Першы экземпляр — Брэсцкай абласной бібліятэцы, другі — Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі...

На рэверсе — імя фундатара: Мікалай Радзівіл Чорны. Навукоўцы дадалі: князь — не толькі спонсар, ён — ідэйны натхніцель выдання. Ён хацеў зрабіць горад цэнтрам пратэстантызму. Берасцейскі стараста памёр 29 мая 1565 года. Так атрымалася, што 29 мая падчас "круглага стала" дата ўсплыла. Выпадкова. Плануючы форум, на яе не арыентаваліся. Бываюць жа такія супадзенні...

Няма, шкада, у Брэсце вуліцы Радзівіла. Але на помніку тысячагоддзя горада стаіць яго фігура. А вось памяць пра брэсцкага першадрукара Бернарда Ваявудку не ўвекавечана. Упэўнена, прыйдзе і яго час.

Ну і пра дыяметр торта да юбілею Брэсцкай Бібліі, нарэшце. Загадчык аддзела рэдкіх кніг Расійскай нацыянальнай бібліятэкі Мікалай Нікалаеў так загадкава назваў свой даклад. Адказ з вуснаў навукоўца і даўняга сябра Брэста мы пачулі філасофскі: чым большы дыяметр торта, тым больш пазнанага і... непазнанага ў гісторыі Брэсцкай Бібліі.

Валянціна **Казловіч**



*У Брэсцкай Бібліі 738 старонак і 14 гравюр. Па-майстэрску выкананыя застаўкі, віньеткі, вялікія літары. Ёсць каментарыі да тэксту на палях. Гравюры "Патоп", "Калены Ізраілевы", "Фантан" лічацца шэдэўрамі графікі XVI стагоддзя*

Валянціна Казловіч. Вяртанне Брэсцкай Бібліі